чэнкаў, У. Кур'ян, А. Рашчынскі, В. Помазаў, А. Мдзівані і інш. Дзейнасць кампазітараў у гэты перыяд характарызуецца большай цікавасцю да асобных народных інструментаў. Так, амаль у тры разы павялічылася колькасць твораў для цымбалаў. Больш чым у два разы ўзрасла кампазітарская творчасць у галіне музыкі для баяна. Прыкладна ў паўтара разы павялічылася колькасць твораў для домры, у 4,5 разы — для дудкі. У апошні перыяд былі напісаны першыя творы для гітары.

Абагульняючы дзейнасць кампазітараў Беларусі ў галіне народна-інструментальнай музыкі, трэба заўважыць, што гэтая галіна творчасці, як ніякая іншая, прыцягвала ўвагу кампазітараў. Няма амаль ніводнага кампазітара Беларусі, які б не напісаў твораў для асобных народных інструментаў, ансамбляў ці аркестраў.

Кароткі, усяго 70 гадоў, перыяд існавання народна-інструментальнай культуры акадэмічнага тыпу даваў кампазітарам пэўную свабоду эксперыменту. Амаль кожнага з кампазітараў можна назваць наватарам у новай для Беларусі галіне кампазітарскай творчасці.

Репозиторий БГУКИ

**Ражкова Л.Л.,**
аспірантка кафедры
народна-інструментальнай творчасці

## НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ДЗІЦЯЧЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ ГУРТОЎ

Нацыянальная самасвядомасць асобы — праблема, якая прыцягвае да сябе ўвагу айчынных і замежных навукоўцаў. Філасофска-сацыялагічны яе аспект атрымаў сваю распрацоўку на працягу 60—90-х гадоў XX стагоддзя. Педагогі ж звярнуліся да гэтай тэмы толькі напрыканцы 80-х гадоў.

Л.А. Альшэўская, А.А. Грымаць, А.А. Міхневіч і іншыя даследчыкі, што распрацоўвалі вызначаную тэматыку, зыходзілі з таго, што нацыянальная самасвядомасць асобы — гэта “суб’ектыўнае адлюстраванне аб’ектыўна існуючых нацыянальных фактараў жыцця грамадства”. У працэсе фарміравання на яе ўплываюць шматлікія фактары як аб’ектыўнага, так і суб’ектыўнага характару.

Пакуль што працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы вывучаўся толькі ва ўмовах навучання агульнаадукацыйных школ і вышэйшых навучальных устаноў. Адным са шляхоў удасканалення працэсу фарміравання гэтага віду самасвядомасці асобы, на думку Л.А. Альшэўскай, А.А. Грымаця, Н.К. Катовіча, з’яўляецца павелічэнне ролі традыцыйнай (фальклорнай) культуры ў педагагічным працэсе навучальных устаноў. Стварэнне моцнага асяроддзя, шырокае выкарыстанне нацыянальных традыцый і звычаяў, твораў вуснай народнай творчасці дапамагаюць асобе адчуць лучнасць з прадстаўнікамі пэўнай нацыянальнай супольнасці.

Згодныя з гэтым меркаваннем, мы дапусцілі, што нацыянальная самасвядомасць удзельнікаў фальклорных гуртоў павінна быць значна вышэйшай за нацыянальную самасвядомасць асоб, якія не далучаюцца ў такой ступені да традыцыйнай культуры. З мэтай высвятлення стану гэтага віду самасвядомасці ўдзельнікаў фальклорных калектываў мы правялі іх папярэдняе апытанне. Вынікі анкетавання не пацвердзілі нашай першай гіпотэзы. Высветлілася, што значная колькасць апытаных абыякава ставяцца да беларускай мовы і нацыянальнай культуры ўвогуле, лічаць яе нецікавай і непатрэбнай у жыцці. Грунтоўных ведаў фальклорнай спадчыны свайго народа яны не маюць і не імкнуцца да больш глыбокага яе спасціжэння.

Нечакана заўважаная супярэчнасць паміж рэальным станам нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў фальклорных калектываў і нашымі чаканнямі абумовіла далейшы ход даследавання, мэтай якога стала выпрацоўка

шляхоў удасканалення працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы ў дзейнасці фальклорных гуртоў.

Быў праведзены канстатуючы эксперымент, у якім даследаваліся ўдзельнікі дзіцячых фальклорных ансамбляў (узорнага фальклорнага ансамбля "Забава" СШ № 190 Мінска, Нацыянальнага ўзорнага ансамбля песні і танца "Зорачка" Рэспубліканскага нацыянальнага цэнтра дзяцей і моладзі, узорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля "Жалейка" падлеткавага клуба "Калейдаскоп"). Усе адзначаныя калектывы працуюць на аснове фальклорных музычна-песенна-харэаграфічных традыцый і адносна блізкія ў інтэрпрэтацыі фальклорнага матэрыялу. Агульная колькасць апытаных — 71 чалавек ва ўзросце ад 11 да 15-ці гадоў.

У ходзе падрыхтоўкі эксперыменту ставіліся наступныя задачы: 1) дакладнае вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў абраных калектываў; 2) аналіз умоў і фактараў, якія актывізуюць або, наадварот, стрымліваюць фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы ў дзейнасці адзначаных калектываў.

Адпаведна акрэсленым задачам былі выкарыстаны метады інтэрв'юіравання кіраўнікоў гуртоў, назірання, аналізу дакументацыі, гутаркі з удзельнікамі і іх бацькамі, анкетавання. Аналізавалася праца хормайстраў ансамбляў, улічваліся яе мэтанакіраванасць, комплекснасць, адпаведнасць навучальна-выхаваўчаму плану калектыву, праца з бацькамі, рэпетыцыйны працэс у калектывах. Методыка вывучэння ўзроўню сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці асобы складалася з некалькіх частак. Адной з іх быў фактарны аналіз, мэтай вывучэння якога было ўсведамленне ўдзельнікамі фактараў, што яднаюць прадстаўнікоў нацыі. Аналіз паказаў, што для ўдзельнікаў аматарскіх мастацкіх калектываў перш за ўсё характэрнае адчуванне еднасці праз нацыянальныя песні і танцы, што складае 90% ад усёй колькасці апытаных.

Рэпазіторый БДПУ

Такі ж высокі паказчык у свядомасці выхаванцаў маюць фактары роднай зямлі (90%) і нацыянальных традыцый і абрадаў (80%). Значна меншую ролю ў нацыянальнай самасвядомасці асобы адыгрываюць фактары нацыянальных мовы, літаратуры і мастацтва, а таксама агульнасці паходжання. Фактар наяўнасці сваяцкіх сувязей амаль не адыгрывае ніякай ролі ў самасвядомасці ўдзельнікаў фальклорных гуртоў.

Для вывучэння ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў калектываў намі былі распрацаваны анкеты. Ліст апытання складаўся з чатырох блокаў, у кожным з якіх згодна структуры нацыянальнай самасвядомасці асобы ўлічваліся веды, пачуцці, адносіны і нацыянальныя па змесце паводзіны. Першы з іх тычыўся нацыянальнай мовы, другі і трэці адлюстроўвалі адносіны і веды матэрыяльнай і духоўнай нацыянальнай культуры. Чацвёрты вывучаў адносіны да сучаснага нацыянальнага быцця, яго надзённых праблем.

На падставе вынікаў анкетавання мы вызначылі ўзроўні сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў абраных калектываў, якія адлюстравалі ў наступнай табліцы.

| Узроўні | Калектывы | | |
|---|---|---|---|
| | "Жалейка", 26 чалавек | "Зорачка", 18 чалавек | "Забава", 27 чалавек |
| Высокі | 8 % | 17 % | 22 % |
| Сярэдні | 30 % | 44 % | 56 % |
| Нізкі | 62 % | 39 % | 22 % |

Лічбы табліцы паказваюць, што колькасць удзельнікаў з высокім узроўнем сфарміраванасці нацыянальнай самасвядомасці з'яўляецца невялікай (8 % у "Жалейцы", 17 % у "Зорачцы", 22 % у "Забаве"). У калектывах "Забава" і "Зорачка" займаюцца дзеці пераважна з сярэднім узроўнем нацыянальнай самасвядомасці. Дзеці з нізкім



Репозиторий БГУКИ

узроўнем складаюць аснову фальклорнага ансамбля "Жалейка".

Праведзены аналіз навучальна-выхаваўчых планаў калектываў, гутаркі з кіраўнікамі, бацькамі і ўдзельнікамі, аналіз рэпертуару і назіранні за рэпетыцыйным працэсам у калектывах паказваюць, што нейкай асаблівай увагі выхаванню нацыянальна свядомай асобы ў межах заняткаў у названых калектывах не надаецца. Толькі хормайстар фальклорнага ансамбля "Забава" ставіць перад сабой дакладна вызначаную задачу, што і адлюстравана ў навучальна-выхаваўчым плане гурта. Хормайстры "Жалейкі" і "Зорачкі" задач выхавання нацыянальна свядомай асобы не ставяць і не вырашаюць.

На падставе вынікаў канстатуючага эксперыменту была распрацавана наступная гіпотэза. Лічым, што эфектыўнасць працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы ў дзейнасці фальклорных гуртоў залежыць ад таго, у якой ступені забяспечана гармонія педагагічнай і мастацка-творчай працы ў гэтых калектывах і наколькі фальклор рэалізуе ў іх свае сацыяльныя функцыі.

**Шэдава А.В.,**
аспірантка кафедры
беларускай і сусветнай
мастацкай культуры

## ДА ПЫТАННЯ АБ СЦЭНІЧНЫМ УВАСАБЛЕННІ МУЗЫЧНА-КАМЕДЫЙНАГА ЖАНРУ
(праца рэжысёра)

Опера-буф, камічная опера, камедыя-балет, вадэвіль, аперэта, мюзікл — музычна-тэатральныя жанры камедыйнага характару, драматычнае дзеянне ў якіх арганічна спалучаецца з музыкай, спевамі, танцамі. Гісторыя фарміравання і эвалюцыі гэтых жанраў налічвае не адно стагоддзе. Нязменная папулярнасць іх у гледача заключаецца ў дэмакратызме і ў асаблівым аптымізме.



Репозиторий БГУКИ